Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар БДУКМ
_____Н.У.Карчэўская
25 чэрвеня 2026 г.
Рэгістрацыйны № ВД- 6/26-149 / эвуч.

ДАСЛЕДЧЫ СЕМІНАР

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці паглыбленай вышэйшай адукацыі
7-06-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

2026

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта паглыбленай вышэйшай адукацыі АСВА 7-06-0322-03-2023 па спецыяльнасці 7-06-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 31.05.2023 № 162, вучэбнага плана БДУКМ па спецыяльнасці 7-06-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Прафілізацыя: Культурная спадчына і музеялогія

СКЛАДАЛЬНІК:

І.Г.Лупашка, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

Я.Л.Краснова, вядучы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Беларусі», кандыдат культуралогіі;

Т.У.Рацько, начальнік навукова-даследчага аддзела ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 18.04.2026);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 24.06.2026)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Даследчы семінар» прызначана для засваення студэнтамі паглыбленай вышэйшай адукацыі. Актуальнасць вучэбнай дысцыпліны абумоўлена неабходнасцю фарміравання прафесійных кампетэнцый маладых навукоўцаў, якія займаюцца даследаваннямі ў сферы музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Сучасныя сацыякультурныя ўмовы патрабуюць ад спецыяліста не толькі практычных навыкаў, але і здольнасці да глыбокага навуковага асэнсавання працэсаў дакументавання, аховы і рэпрэзентацыі культурнай спадчыны.

Мэта вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне ў студэнтаў кампетэнцый, неабходных для самастойнага правядзення навуковага даследавання ў сферы музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны, афармлення і прэзентацыі яго вынікаў у выглядзе магістарскай дысертацыі і навуковых публікацый.

Задачы вучэбнай дысцыпліны:

– азнаёміцца са спецыфікай навукова-даследчай дзейнасці;

– сфарміраваць уяўленне пра логіку, структуру і метады навуковага даследавання;

– засвоіць асноўныя этапы працы над магістарскім даследаваннем;

– авалодаць методыкай пошуку, аналізу і сістэматызацыі навуковай інфармацыі;

– разглядзець формы навуковай камунікацыі і адпаведныя ім спосабы апрабацыі вынікаў навуковых даследаванняў (уключаючы выставачныя фарматы);

– развіць навыкі для публічнай прэзентацыі вынікаў даследавання.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны магістрант павінен сфарміраваць наступныя ўніверсальныя кампетэнцыі:

– прымяняць метады навуковага пазнання ў даследчай дзейнасці, генерыраваць інавацыйныя ідэі;

– развіваць інавацыйную ўспрымальнасць і здольнасць да інавацыйнай дзейнасці;

– праводзіць крыніцазнаўчы, гістарыяграфічны, культралагічны, мастацтвазнаўчы аналіз, неабходны для даследавання, захавання і выкарыстання аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны;

– інтэрпрэтаваць фундаметальныя культурныя ўніверсаліі і адрозненні грамадства на лакальным і рэгіянальным узроўнях;

– развіваць здольнасць да інавацыйнай дзейнасці і ўспрымальнасць да змен у прафесійным асяроддзі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

– асноўныя нарматыўна-прававыя дакументы, якія рэгламентуюць навукова-даследчую дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь;

– характарыстыкі і прынцыпы навукова-даследчай дзейнасці;

– паслядоўнасць этапаў працы над магістарскім даследаваннем і іх змест;

– сучасныя крыніцы навуковай інфармацыі па профілю даследавання;

умець:

– асэнсоўваць навуковую праблему, абгрунтоўваць яе актуальнасць у кантэксце музейнай справы;

– ажыццяўляць адбор адпаведных навуковых метадаў і падыходаў;

– праводзіць комплексны пошук, крытычны аналіз і сінтэз навуковай інфармацыі па тэме даследавання;

– апрабіраваць і аргументавана абмяркоўваць вынікі навуковага даследавання;

валодаць навыкамі:

– акадэмічнага пісьма і самастойнай даследчай дзейнасці;

– ажыццяўлення камунікацыі ў навуковым асяроддзі;

– прэзентацыі вынікаў навуковага даследавання;

– ўкаранення высноў даследавання ў музейную практыку.

У ходзе адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць асабісты каштоўнасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, які гатовы да актыўнага ўдзелу ў сацыяльна-культурным жыцці краіны.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Даследчы семінар» распрацавана з улікам пастаўленых задач, мае міжпрадметныя сувязі з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Актуальныя пытанні музейнай справы», «Гісторыя і метадалогія вывучэння культурнай спадчыны», «Музеефікацыя і актуалізацыя культурнай спадчыны» і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкарыстоўваюцца рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў. У практыку правядзення практычных заняткаў укараняюцца методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя і дыялогавыя формы. Індывідуальныя заданні накіраваны на развіццё самастойных даследчых навыкаў, пошук неабходнай інфармацыі ў

навукова-метадычнай літаратуры, інтэрнэт-крыніцах. Выкарыстоўваючы кантэнт-аналіз крыніц, прысвечаных актуальным праблемам у сферы музейнай дзейнасці і аховы гісторыка-культурнай спадчыны, студэнты падрыхтоўваюць даклады, рэфераты, мультымедыйныя прэзентацыі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Даследчы семінар» усяго прадугледжана 156 гадзін, з якіх 52 – аўдыторных. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 18 гадзін, практычныя заняткі – 34 гадзіны. Рэкамендуемая форма правядзення бягучай атэстацыі – вуснае апытанне, тэсціраванне. Рэкамендаваная форма правядзення прамежкавай атэстацыі – залік.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Тэма 1. Уводзіны. Навукова-даследчая дзейнасць: сутнасць, асноўныя паняцці і тэрміналогія

Прадметнае поле, мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны. Значэнне паняццяў «навука» «навуковае мысленне» «навуковыя веды», «навуковая дзейнасць», «навукова-даследчая дзейнасць», «навуковая супольнасць» і інш.

Навука як дзейнасць па выпрацоўцы і сістэматызацыі аб'ектыўных ведаў. Аб'ект і суб'ект навуковага пазнання. Навука як сацыяльны інстытут. Узроўні навуковага пазнання (эмпірычны і тэарэтычны). Класіфікацыя відаў навукова-даследчай дзейнасці. Суб'екты навукова-даследчай дзейнасці (фізічныя асобы, навуковыя калектывы, навуковыя ўстановы і арганізацыі і інш.). Спецыфіка арганізацыі навуковых даследаванняў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Вынікі навукова-даследчай дзейнасці, спосабы іх прадстаўлення.

Тэма 2. Арганізацыя і нарматыўна-прававая база навуковай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь

Нарматыўна-прававая база навуковай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь. Закон Рэспублікі Беларусь «Аб навуковай дзейнасці». Роля суб'ектаў дзяржаўнага кіравання ў сферы навуковай дзейнасці (Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, Вышэйшая атэстацыйная камісія, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіям, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі).

Паняцце «ўніверсітэцкая навука». Міжнароднае супрацоўніцтва ў навуковай сферы і прыярытэтныя кірункі айчынных даследаванняў.

Навуковыя школы. Навуковая школа ў галіне музеязнаўства «Тэорыя і практыка музейнай справы»: заснаванне, персаналіі, асноўныя дасягненні і перспектывы.

Крытэрыі кваліфікацыі навуковага работніка. Вучоныя ступені і званні.

Тэма 3. Змест і спецыфіка навукова-даследчай дзейнасці магістранта

Тэарэтычныя асновы магістарскай дысертацыі. Прафесійныя кампетэнцыі.

Арганізацыйныя асаблівасці працы. Распрацоўка і выкананне індывідуальнага плана работы магістранта.

Формы навукова-даследчай работы магістранта: выкананне заданняў навуковага кіраўніка; падрыхтоўка тэзісаў, дакладаў, артыкулаў; удзел у круглых сталах і навуковых семінарах, канферэнцыях і інш.; удзел у распрацоўцы навуковай тэмы кафедры; прадстаўленне прамежкавых вынікаў

даследавання на навукова-даследчым семінары і абмеркаванне на кафедры; падрыхтоўка і абарона магістарскай дысертацыі; практычнае ўкараненне вынікаў даследавання.

Псіхалагічныя аспекты працы над даследаваннем. Тайм-менеджмент у навуковай працы. Самапрэзентацыя магістранта ў акадэмічнай супольнасці.

Тэма 4. Магістарская дысертацыя як кваліфікацыйная работа. Асноўныя этапы працы

Падрыхтоўчы этап. Вызначэнне тэмы даследавання і прызначэнне навуковага кіраўніка. Прадстаўленне і зацвярджэнне тэмы на пасяджэнні кафедры. Складанне індывідуальнага плана работы магістранта.

Асноўны этап (даследчы). Абгрунтаванне актуальнасці тэмы даследавання ў кантэксце сучаснага музейнага дыскурсу. Вызначэнне мэты і задач, аб'екта і прадмета, абгрунтаванне навізны даследавання. Фарміраванне гіпотэзы, распрацоўка тэарэтыка-метадалагічных асноў даследавання. Напісанне тэксту магістарскага даследавання. Складанне спісу выкарыстанных крыніц. Падрыхтоўка дадаткаў. Афармленне навуковай работы згодна са стандартам.

Завяршальны этап (практычны). Праверка ў сістэме «Антыплагіят». Папярэдняя абарона магістарскага даследавання на кафедры. Праца з рэцэнзентамі. Атрыманне актаў аб практычным укараненні вынікаў даследавання. Абарона магістарскай дысертацыі.

Тэма 5. Інфармацыйнае забеспячэнне навуковага даследавання. Праца з крыніцамі

Класіфікацыя крыніц навуковай інфармацыі: першасныя (архіўныя дакументы, справаздачы аб НДР), другасныя (бібліяграфічныя і рэфератыўныя рэсурсы), трэцічныя.

Агляд навуковых выданняў па профілі даследавання: часопісы, зборнікі навуковых прац, матэрыялы канферэнцый, статыстычныя дадзеныя. Значэнне электронных бібліятэк, рэпазіторыяў і навукаметрычных баз дадзеных у сучасным даследаванні.

Музейныя фонды як крыніцазнаўчая база даследавання.

Крытэрыі ацэнкі навуковых крыніц: актуальнасць, дакладнасць, рэлевантнасць, аўтарытэтнасць аўтара і выдання.

Сістэматызацыя адабранага матэрыялу. Прынцыпы пабудовы аналітычнага агляду (храналагічны, тэматычны). Правілы навуковага цытавання і этыка даследчыка.

Тэма 6. Метадалогія і метады даследаванняў

Класіфікацыя навуковых даследаванняў: фундаментальныя, прыкладныя, пошукавыя.

Метадалагічны апарат даследавання. Алгарытм фармулявання ключавых кампанентаў: навуковая праблема, тэма, аб'ект, прадмет, мэта, задачы і гіпотэза даследавання. Крытэрыі выбару актуальнай тэмы: навуковая навізна і практычная значнасць. Работа з паняційна-катэгарыяльным апаратам. Тэарэтычнае абгрунтаванне і вызначэнне межаў даследавання.

Класіфікацыя метадаў навуковага пазнання. Тэарэтычныя метады (аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя, мадэляванне, ідэалізацыя) і эмпірычныя метады (назіранне, параўнанне, эксперымент, вымярэнне).

Спецыфічныя метады сацыягуманітарных навук: інтэрв'ю, апытанне (анкетаванне), кантэнт-аналіз дакументаў, кейс-метад, метад экспертных ацэнак, бібліяметрычны і навукаметрычны аналіз.

Семіятычны і аксіялагічны падыходы ў музеязнаўчых даследаваннях і вывучэнні культурнай спадчыны. Асаблівасці палявых даследаванняў: этнаграфічныя экспедыцыі, фіксацыя нематэрыяльнай спадчыны і інш.

Абгрунтаванне выбару метадаў для вырашэння канкрэтных задач.

Тэма 7. Публікацыйная актыўнасць маладога вучонага

Асаблівасці навуковай мовы і тэрміналогіі. Формы публікацыйнай актыўнасці даследчыка: манаграфія, навуковы артыкул, тэзісы дакладаў, матэрыялы канферэнцыі, зборнік навуковых прац, аўтарэферат дысертацыі і інш.

Віды навуковых часопісаў. Па мэтавым прызначэнні (навукова-тэарэтычныя, навукова-практычныя і інш.), па індэксацыі ў базах дадзеных (ВАК, РІНЦ, Scopus/Web of Science), па змесце (навуковыя, навукова-папулярныя).

Навукаметрычныя паказчыкі ацэнкі навукова-даследчай дзейнасці вучонага (колькасць публікацый, індэкс цытуемасці, імпакт-фактар часопіса, індэкс Хірша і інш.).

Навуковы артыкул. Тыпы навуковых артыкулаў (аналітычныя, аглядныя, навукова-тэарэтычныя, навукова-практычныя, навукова-публіцыстычныя і інш.).

Асноўныя патрабаванні да навуковага артыкула: актуальнасць даследуемай тэмы, акадэмічнасць, яснасць і логіка выкладу, выразная аўтарская пазіцыя, дакладнасць эмпірычных паказчыкаў, захаванне маральна-этычных нормаў.

Тэма 8. Навуковая камунікацыя і імідж маладога вучонага

Навуковая камунікацыя як сукупнасць відаў навуковых зносін у навуковай супольнасці.

Тыпы навуковых мерапрыемстваў: па фармаце (канферэнцыі, сімпозіумы, форумы, круглыя сталы і інш.); па маштабу (міжнародныя, рэгіянальныя, нацыянальныя, лакальныя).

Правядзенне навукова-асветных мерапрыемстваў у музеі.

Імідж маладога вучонага. Прафесійныя і асабістыя якасці.

Тэма 9. Публічная абарона вынікаў даследавання

Падрыхтоўка даклада і візуальнага афармлення (прэзентацыі) вынікаў магістарскай працы. Правілы стварэння эфектыўных мультымедыйных прэзентацый.

Тэхніка публічнага выступлення і культура навуковай дыскусіі. Выкананне рэгламенту. Правілы ўзаемадзеяння з аўдыторыяй.

Прыёмы ўкаранення вынікаў даследавання ў практычную дзейнасць музеяў (акты аб укараненні). Падрыхтоўка дапаможных матэрыялаў (карты, макеты, раздатачны матэрыял) для атэстацыйнай камісіі.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
(дзённая форма атрымання адукацыі)

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела,тэмы	Колькасць аўдыторных заняткаў		Форма кантролю ведаў
		Лекцыі	Практычныя заняткі	
1.	Уводзіны. Навукова-даследчая дзейнасць: сутнасць, асноўныя паняцці і тэрміналогія	2	2	
2.	Арганізацыя і нарматыўна-прававая база навуковай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь	2	4	падрыхтоўка рэфератаў, прэзентацый
3.	Змест і спецыфіка навукова-даследчай дзейнасці магістранта	2	4	падрыхтоўка рэфератаў, прэзентацый
4.	Магістарская дысертацыя як кваліфікацыйная работа. Асноўныя этапы працы	2	4	падрыхтоўка рэфератаў, прэзентацый
5.	Інфармацыйнае забеспячэнне навуковага даследавання. Праца з крыніцамі	2	4	падрыхтоўка рэфератаў, прэзентацый
6.	Метадалогія і метады даследаванняў	2	4	падрыхтоўка рэфератаў, прэзентацый
7.	Публікацыйная актыўнасць маладога вучонага	2	4	падрыхтоўка рэфератаў, прэзентацый
8.	Навуковая камунікацыя і імідж маладога вучонага	2	4	падрыхтоўка рэфератаў, прэзентацый
9.	Публічная абарона вынікаў даследавання	2	4	падрыхтоўка рэфератаў, прэзентацый
	Усяго	**18**	**34**	

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
(завочная форма атрымання адукацыі)

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела,тэмы	Колькасць аўдыторных заняткаў		Колькасць гадзін для самастойнага вывучэння
		Лекцыі	Практычныя заняткі	
1.	Уводзіны. Навукова-даследчая дзейнасць: сутнасць, асноўныя паняцці і тэрміналогія	1		4
2.	Арганізацыя і нарматыўна-прававая база навуковай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь	1		4
3.	Змест і спецыфіка навукова-даследчай дзейнасці магістранта	1	1	4
4.	Магістарская дысертацыя як кваліфікацыйная работа. Асноўныя этапы працы	1	1	6
5.	Інфармацыйнае забеспячэнне навуковага даследавання. Праца з крыніцамі	1	1	4
6.	Метадалогія і метады даследаванняў	1	1	4
7.	Публікацыйная актыўнасць маладога вучонага		1	4
8.	Навуковая камунікацыя і імідж маладога вучонага		1	4
9.	Публічная абарона вынікаў даследавання		2	4
	Усяго	**6**	**8**	**38**

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

Літаратура

Асноўная літаратура

1. Мерко, М. А. Научно-исследовательский семинар : учебное пособие / М. А. Мерко, Ю. А. Маглинец, И. С. Мерко. - Красноярск : Сибирский федеральный университет, 2022. - 252 с. - URL: https://znanium.com/catalog/product/2091394 (дата обращения: 25.05.2026).
2. Думнова, Э. М. Методика и методология научного исследования : учебное пособие / Э. М. Думнова; Новосиб. гос. ун-т экономики и управления. – Новосибирск: НГУЭУ, 2024. – 139 с. – URL: https://znanium.ru/catalog/product/2186275 (дата обращения: 25.05.2026).

Дадатковая літаратура

1. Закирова, А. Ф. Магистерская диссертация как научно-педагогическое исследование / А. Ф. Закирова, И. В. Манжелей. – Москва; Берлин: Директ-Медиа, 2017. – 141 с. –URL: http://biblioclub.ru/index.php? page-b...&id=482856 (дата обращения: 22.03.2026).

2. Здасюк, Н. М. Новые подходы к исследовательской деятельности музеев Беларуси / Н. М. Здасюк // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя 3, Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2004. – № 2. – С. 21-24.

3. Цифровые технологии и ресурсы учреждений культуры, архивов и служб документационного обеспечения управления как объект исследований и проектных разработок / Н. И. Колкова, Г. Ф. Леонидова, Е. Н. Малышева [и др.]; под ред. И. Л. Скипор. – Кемерово: КемГИК, 2024. – 370 с. – URL: https://e.lanbook.com/book/484565 (дата обращения: 06.04.2026).

4. Янковская, В. В. Организация научно-исследовательской работы студентов (магистров): учебное пособие / В. В. Янковская. – 2-е изд., перераб. и доп. – Москва: ИНФРА-М, 2023. – 345 с. – (Высшее образование: Магистратура). –URL: https://znanium.ru/catalog/product/1913521 (дата обращения: 25.03.2026).

Характарыстыка рэкамендуемых педагагічных тэхналогій і метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Даследчы семінар» рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання: лекцыйныя і практычныя заняткі. У практыку правядзення практычных заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя метады (групавыя дыскусіі, мадэліраванне практычных сітуацый і інш.), візуальныя метады (метады ілюстрацыі, дэманстрацыі, відэаматэрыялы).

У ліку эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, вылучаюцца тэхналогіі: праблемнага навучання; развіцця крытычнага мыслення; праектнага навучання; камунікацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.

Для дыягностыкі атрыманых студэнтамі ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў: вусныя апытанні па асобных тэмах; падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый па тэме магістарскай дысертацыі; выступленні студэнтаў на практычных занятках па тэме магістарскай дысертацыі; падрыхтоўка навуковага артыкула да друку і даклада для ўдзелу ў канферэнцыі; перадабарона кваліфікацыйнай работы.